Андрей Александровъ

# Клятва

Перад партыяй любімай
І совецкаю Радзімай,
Перад бацькаўскаю хатай
Я ніўчым не вінаваты,
— Не!

А мяне аганьбавалі,
Без віны арыштавалі,
Пасадзілі за сто кратаў,
Я ніўчым не вінаваты,
— Не!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Але будзем разам, беці,
Будуць з намі нашы дзеці,
Будзем жыць многа багата
Бо ніўчым не вінават я,
— Не!

# Лісты

Сяджу адзін і раскрываю
Як свой сардэчны скарб, лісты
Што мне пісала, дарагая,
З далёкай бацькаўшчыны ты.
О, колькі ў іх тугі нястрымнай,
Жывога подыху агня.
Твае лісты, мой друг любімы,
Я перачытваю штодня...

Б...

З пад цёмнага крыла глухой палярнай ночы,
З пад белых саванаў пустыні ледзяной,
Праз пасвісты пургі і ветра голас воўчы
Я рвуся да цябе,
Хачу я быць з табой.
Хачу пачуць вясну, шаўковы шэлест луга,
Хачу вярнуць жыццё, любіць, тварыць, спяваць.
А тут жыцця няма,
Тут – за палярным кругам
Мне суджана не жыць, а існаваць.
Я тут, мой друг, без племені і роду,
Адзін, як сірата, сярод чужых людзей.
І толькі ў думках – ты,
З табой – мая Свабода,
Ты мне мілей за ўсіх,
Між. родных мне радней...

## Нявольніцкі караван

Не гадаў я і не думаў,
Эх, судзьба мая.
Бруд, смурод і змрочнасць турма
Не забуду я.

Люду рознага набіта,
Малнка ў баржы.
Тут злодзеі і бандыты,
Слова не скажы.

Зганьбаваны, адарваны
Ад сваіх дзяцей.
І цяпер... турма на хвалях,
Бурны Енісей.

Нібы ў яме, ў цёмнай скрыне
Пад замком сяджу.
Без злачынства, як злачынец
Кінуты ў баржу.

Славіў сонца і Свабоду,
Маладосць спяваў.

Сэрца ўсё сваё народу
Ў песнях аддаваў.

І за гэта мін зладзеяў
Каб загінуў ён
Ўніз вязуць па Енісею
Ў тундру мерзлаты...

*

Нікому не зайздрошчу я на свеце,
Нікога і нічым я не віню.
Іду на сустрач сонечнаму дню,
Я веру –
Сонца мне шчыра засвеціць.

## Лісты

Сяджу адзін і раскрываю
Як свой сардэчны скарб, лісты
Што мне пісала, дарагая,
З далёкай бацькаўшчыны ты.
О, колькі ў іх тугі нястрымнай,
Жывога подыху агня.
Твае лісты, мой друг любімы,
Я перачытваю штодня...

Б..

З пад цёмнага крыла глухой палярнай ночы,
З пад белых саванаў пустыні ледзяной,
Праз пасвісты пургі і ветра голас воўчы
Я рвуся да цябе,
Хачу я быць з табой.
Хачу пачуць вясну, шаўковы шэлест луга,
Хачу вярнуць жыццё, любіць, тварыць, спяваць.
А тут жыцця няма,
Тут - за палярным кругам
Мне суджана не жыць, а існаваць.
Я тут, мой друг, без племені і роду,
Адзін, як сірата, сярод чужых людзей.
І толькі ў думках - ты,
З табой - мая Свабода,
Ты мне мілей за ўсіх,
Між родных мне радней...

# Нявольнічы караван

Не гадаў я і не думаў,
Эх, судзьба мая.
Бруд, смурод і змрочнасць трума
Не забуду я.

Люду рознага набіта,
Лаянка ў баржы.
Тут злодзеі і бандыты,
Слова не скажы.

Зганьбавалі, адарвалі
Ад сваіх дзяцей.
І цяпер... турма на хвалях,
Бурны Енісей.

Нібы ў яме, ў цёмнай скрыні
Пад замком сяджу.
Без злачынства, як злачынец
Кінуты ў баржу.

Славіў сонца і Свабоду,
Маладосць спяваў.

Сэрца ўсё сваё народу
У песнях аддавай.

І за гэта ліхадзеі
Каб загінуў ты
Уніз вязуць па Енісею
У тундру мерзлату...

*

Нікому не зайздрошчу я на свеце,
Нікога і нічым я не віню.
Іду на сустрач сонечнаму дню,
Я веру –
Сонца мне шчэ засвеціць.

## Ты, даруй мне...

Не разбойнік я, не Каін
І не валацуга,
А гібею ў дзікім краі
За палярным кругам.

Лёг на грудзі мне пакутай
Тундры край пустынны.
Ты, даруй мне цяжкі смутак,
Родная краіна...

## Дуйце ветры

Дуйце ветры, ганіце за мора
Стынь палярную цемры глухой
Ой, ці скора мінуе, ой, ці скора
Ўбачу сонца я над сабой?

Тое сонца, што ў ціхіх вазёрах
Мые косы свае раніцой,
Што ў прасторах, ля срэбнае горы,
Шматтварчага зелле расой.

Што так ветліва, ля маціцы
Песціць роднае сэрцу дзіця,
Чакавена ў адчаі прытуліць
І абудзіць любоў да жыцця.

Ой, ці скора мінуе, ой, ці скора
Ўбачу сонца я над сабой?
Дуйце ветры; ганіце за мора
Стынь палярную цемры глухой...

## Нічога не знаю...

Штодня я трывожна чагосці чакаю,
Што будзе са мною – нічога не знаю.
Ці смерць я сваю нечакана знайду
Між вечнага снегу і вечнага льду.
Ці лёс усміхнецца і прыдзецца зноў
Пазнаць мне Свабоду, жыццё і любоў.
Нічога не знаю, што будзе са мной,
Адно толькі ў сэрцы жыве неспакой...

## Пройдзе ўсё...

За палярным кругам
У гушчы нямой,
Чорнае, як вугаль,
Неба над зямлёй.

Ласкавага слова
А не ўчуеш тут.
На грудзях сінякі
Крыўды і пакут.

Прападаюць годы,
А хочацца жыць.
Ветры непагоды
Не сціхаюць выць.

Толькі ў нетрах сэрца
Агенькі надзей.
Чым цяжэй жывецца —
Зьзяюць палымней!

Не схілю ў прасторах
Тундры галаву.

Змову сілы чорнай
Я перажыву.

Пройдзе ўсё. Не плачу.
Усё перацярплю.
Веру: я ўбачу
Тых, каго люблю...

× × ×

Няволя мяне надламала
Зваліўшыся крыжам на грудзі.
Мінулага шчасця не стала
І будучага не будзе...

# Пасланне

дачушцы Карыне.

О, каб меў я крылы птушкі
(Як народ у казках баіць)
Паляцеў-бы, дарагая,
Да цябе, мая дачушка.
Панад хмарамі, высока
Я падняўся-бы, як сокал,
Аб адным бы толькі мару:
Прамінуць хутчэй абшары, -
Тундры дзікай, непрыветнай
Дзе не знаюць людзі лета;
Дзе стасільным ураганам
Дуюць ветры акіяна;
Дзе пурга штодня шалее
Так, што сэрца леддзянее.
Дзе і сонейка знікае,
Дзе пануе над снягамі
Бесперабудна, месяцамі
Ноч палярная, глухая...
Да цябе, мая Карына
Паляцеў-бы я з Дудзінкі.

(дзе душою ты хварэю!)
Развітаўся б з Енісеем.
Праляцеў-бы я страною
Над сібірскаю тайгою.
Шлях мне чысцілі-б ветры,
Ноччу зоркі б мне зьзялі.
З песьняй я ляцеў-бы ў далеч
Кілометр за кілометрам.
Песьня сілу б мне давала
Волю славячы, шчасьліва,
Праляцеў-бы я імкліва
Панад скаламі Урала.
Па шляху з нябесных ніты,
Цвета чыстага блакіта,
Як бацькоўскі дар, касынку
Я саткаў табе, Карлінка.
Гальштук выткаў-бы чырвоны
З мурных сонечных праменняў.
І сустрэчага натхнёнка
Я ляцеў-бы ў імгненьнях
Над шумлівымі лясамі,
Над квяцістымі лугамі
І травоўгаю абнятыя
Апынуўся б каля хаты,
Дзе жывеш, мая Карлінка,
Чарнавокая дзяўчынка,
З Радаславам родным братам,
З мамкай, Бецi дарагой,
Беці, любага маёй...
Ці то раніцай, ці ў вечар
Я стаў-бы ля парога,

Сэрца білася б трывогай
Надыходзячай сустрэчы.
Вось мы разам!..
Міг кіпучы!
Мы спаткаліся...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Далей.

Эх, Карынашка, балюча
Мне пісаць табе з няволі.
Але будзем, будзем, будзем
Будзем мы яшчэ, як людзі
Жыць шчасліва, дружна жыць,
Толькі б мужна перажыць
Наша гора.
Эх, дачушка,
Сакатушка, вясялушка,
Расцвітай, расці на славу,
Слухай маму,
Любі Славу
І мяне абавязкова
Помні, дзетанька...
Канчаю.
Не вясёлым, бачыш, словам
Я пішу.
— Чаму?
— Бывае!
Падрасцеш, сама пазнаеш.
Будзь здарова.

## Ніколі не забуду

У пустыні ледзяной,
Беспрабуднай ночы,
Я сумую па табе,
Зялёны лісточак.

Я сумую па табе,
Зялёнае поле.
Дзе не буду, не забуду
Радзіма нікалі...

Калі мне дужа цяжка стане,
Не ў магату агорне сум,
Ніхто ў душу мне не загляне
У крыніцу змрочных, цяжкіх дум.

Ніхто мне ласкавага слова
Не скажа ў гэты горкі час,
І не паможа зняць аковы
Тугі і крыўды і абраз.

І цяжка мне, чаго таіцца!
Ці ўбачу я любімых зноў?
Мо' перастане сэрца біцца
У пустыні цемры і вятроў?

Ліць слёзы, плакаць я не ўмею,
Не апускаю галаву.
У сэрцы з свежаю надзеяй
У змроку поўначы жыву...

×

Я не жыву. Мяне няма.
Труною стала мне турма.
Калі маёй Свабоды дзень
Праломіць краты, як прамень,
Тады сцяну я разагну,
Тады я зноў і жыць пачну.
Пакуль, як мур, здавіла цьма.
Я не жыву. Мяне няма.

# Хочацца жыць

Каб ты толькі знаў, заполярны круг
Радзіма вятроў, мерзлаты, завірух
Як хочацца жыць мне.
А ў тундры тваёй
З тваім нізкім небам абмітым смалой,
З тваёй беспрабудна-суровай зімой
Мне цяжка да болі.
Я прагну туды –
Дзе сонца, дзе ў вішнях ірдзеюць сады,
Дзе вырас, у радасцях жыў малады
І песні складаў.
А цяпер, нібы ў сне,
Глумленне, туга, не ўпару ў сівізне,
Скажыце, за што пакаралі мяне,
За што ўсе пакуты?
Хачу быць зусім
Свабодным, як песня ў палёце сваім,
Ніўчым не змяніўся, не стаў я другім
Як быў, так астаўся.
Люблю, як любіў
Народ, верным сынам якога я...

Няўжо горкі лёс мой шляхі мне закрыў
І выйсця не маю?
Няўжо толькі знай,
Трывай, дый з пакорай сілу згінай.
Эх, тундра-няволя, засовы здымай,
Аддай мне Свабоду,
Жыццё мне аддай!..

# Эпіграмы

Пагаворка павлася,
Паслухайце, людзі:
— Колькі-б Колас не купаўся,
Янкай ён не будзе...

П. Бр.

Нічога ўласнага, цікавага нічога
Ўсё толькі водгук —
водгулле чужога...

* * *

Чаму так горка на душы?
Каторы год няма прасвету.
Няўжо няўдасца выйсці з гэтай
Ільдамі скованай цішы?
Прайшлі падзеі па зямлі,
Увесь сусвет дзварушылі.
Мае надломленые крыллі
Пакутай на грудзях ляглі...

## Чорная пурга

Сышліся вятры з чатырох канцоў
І разам раптоўна падулі.
Што сіла сусветная ўсіх вякоў
Лядовыя скалы, сумёты снягоў
Да хмар паднялі, страсянулі –
І валам пагналі ў пустынную даль,
Як пену разгневаных бурных хваль.

Бяда, хто ў дарозе такою парой!
Бушуе шаленства прыроды.
Змяшалася шэрае неба з зямлёй,
Ратунку ніякага.. Чорнай пургой
Жыццё чалавека заўсёды,
Як човен прыбоем раскатаны, міг
І гіне ў абдымку вятроў ледзяных...

## Радыёграмма

Беці, Славік і Карына,
З дальняй рэчкі Енісей,
Прывітанне на айчыну
Шлю на крыллях сакаліных
Вам любімым —
Ваш Андрэй...

# Гусі

Выйшаў я на бераг Енісея.
Не бывала ціхі Енісей.
Вечарэе. Ветлы вецер вее
Прысядаючы каля гусей.

Гусі неўгамонныя хадзілі
Гаварлівым кругам па зямлі,
Набіралі сілу сваім крыллям
Каб дарогай лёгкімі быці.

Сеў і я, стаіўшыся, на камень.
Мо' яны пагутараць са мной?
Мо над беларускімі палямі
Пралятаці гэтаю вясной?

О, каб пазнаць я мову крылаў,
Ці каб крыллі ўласныя я меў —
Знаў-бы ўсё, што гусі гаварылі
І, бясстрашна, тут бы не сядзеў.

Ціха думу думаю. Раптоўна
Гусі зашумелі, загулі,
Мне крылом махнулі і на Поўнач
Сінімі хвалямі неба паплылі.

Зноў адзін я. Лёгкі вецер вее.
Сэрца вырываецца з грудзей.
Плаўна льюцца воды Енісея.
Цішынёю дыша Енісей".

Б.

Становіцца святлей перад вачыма
І прападае ўся туга мая,
Калі пад небам тундры нелюдзімай
Я часам гутару з любімай
Такой жа гаратлівай, як і я...

# Нараджанне дня

На ўсходзе ірдзеючы золак блістае:
Гушкаецца ветліва ў хвалях агня
Як човен, калыска палярнага дня.
Напіўся стужаю цемень начнай
І белых гор снегавых цішыня
Пакорліва раптам канаюць.

У тундру вярнулася сонца. Вароты
Ключом залатым адамкнула. Яно
Што сейбіт, мне кінула ў сэрца зерне
надзеі, імкненняў, пяшчоты.
Вітаю нараджанне дня... Як віно
Іскрыцца месяца з вышынь падолога...

# Мелёдыя...

Ён ходзіць з кута ў кут. Аб дальняй волі
Успаміны ўзварушыліся. Туга
Халоднага іржою ланцуга
Лягла на сэрца стомленае болем.
І ў гэты час, здаецца мне,
Што ён падобен на мяне.

За што жывым ён кінуты ў магілу?
За што ён стаў ахвярай пакут?
Няма прасвету. Ходзіць з кута ў кут —
Апошні ўзлёт цярплівасці і сіл.
І ў гэты час, здаецца мне,
Ён болей схожы на мяне.

Ён не вар'ят і ўмелым не атручан,
А назаве шчаслівым днём
Той дзень, калі з сваім жыццём
Ён развітаецца над кручай.
І ў гэты час, здаецца мне,
Падобным будзе на мяне...

Б.

Вобраз сэрцу мілы,
Беці, вобраз твой -
Да маёй магілы
Будзе жыць са мной...

## Клевета

Бачу хлопчык хлеба просіць,
Ледзь, нішчасны, ногі носіць.
Ён з працягнутай рукой
Стаў, як здань, і прада мной.
Я спытаў яго ў трывозе:
– Хто ты будзеш?
                – Сірата!
– Дзе бацькі?
                – Яны ў вастрозе.
– Хто судзіў іх?
                – Клевета!..
Чую кроў у жылах стыне,
Моўчкі хлопчыка абняў.
Я свайго чамусьці сына
Ў гэты горкі час згадаў.

*

Векавала наша мова
Знаць не знала злога слова
„Клевета".
                І яно наўрат,
Зможа хто на родны лад,

Даць змястоўны, ўсебакова
Поўнакроўны пераклад.
Што-ж яно сабою значыць?
Як яго ператлумачыць?
І адкуль яно прышло
К нам і ў горад і ў сяло?

Раптам чую голас, быццам
Над празрыстаю крыніцай
Шэлест кволага ліста:
— Ты спытай таго, што тлача,
Ён, гаротны, растлумачыць,
Ранай сэрца ён раскажа,
На спіне сваёй пакажа,
Што такое „клевета".
Ясны стане заадно
І адкуль прышло яно...

Ходзіць, бродзіць гэта слова
Між сузор'я нашай мовы,
Нібы чорная варона
Сярод белых гусянят...

. . . . . . . . . . . . . . . . .

# Новы Год

І так, чарговы цяжкі год
Жыццём закрэслены ў расход.
Дарма надзеі я сьцярог
Пра светлы дзень Свабоды.
Дарогай леташнімі нягода
Прыходзе разам з Новым годам,
Зноў той-жа подых
Крыўды і трывог.

Зноў сэрца ў чорных лапах гора,
І сёння цемень, як і ўчора
Туга па роднай старане
Па другу дзецях любых мне.
Таіцца ціха ў сівізне;
Што так прышла не ўпору.

Забудучы гора і бяду
Я веру, што зноў прыйду
У бальвую грамаду —

Як верны сын свайго народу,
Як сокал, вольным зашаву, —
І першы дзень сваёй Свабоды
Я Новым годам назаву!..

(Клевета)

Дзе зласліва да парога
Падпаўзе ліха гадзюкай,
Там — пасяліцца трывога,
Там — з любімаю разлука...

## Міг забыцця

У закутку цёмным на нарах,
Дзе суджана век свой дажыць,
Каб сэрца магло адпачыць
Ад крыўды хаваешся ў марах.

Пра ўсё забываеш, як быццам
Абрыву зусім не было,
І не надламана крыло,
І сум у вачах не дыміцца.

Збягуцца праменьчы-ўспаміны,
Як з вырая птушкі гурбой.
Раскрыюцца перад табой
Прамінулых гадоў пуцявіны.

Пачуеш свае хваляванні
У вірах юнацкіх прыгод.
Згадаеш і ласкаў пяшчот
І першае слова кахання.

І першыя творчыя му...
І радасць, калі ў пяр...

На сустрач шырокаму дню
Ішлі мае песні па кругу.

Убачыш сябе між сваімі
І ўжо як вядзецца здаўна,
Вясёлую чарку віна
Застольная песня падыме.

Як подых прысад, па дарогах
Плыве наша песня, звініць.
Як добра, як хораша жыць
З задорам жыцця маладога...

У міг чараўнічае мары
Свабодна і лёгка ўздыхнеш
І ніба ўжо больш не нясеш
Пакут не заслужанай кары.

## Пройдзе ноч...

Паэму сам сабе пішу
Пра што сумую, чым дышу
І не крыўдую на жыццё,
А рад бязмерна, як дзіцё...

1.

Вже ноч, як вецер белагрыва
Б'ецца ў шыбы лапай снегавой.
Ад чаго так цяжка і тужліва?
Дзе ты, мілы, дзе ты, родны мой?
Я табе сарочку вышываю,
Васількоў шаўковыя кругі.
Хай напомняць аб радзімым краі
У краі вечнай сцюжы і смугі.
Хай табе напомняць, як бывала
Гоман поля слухалі з табой,
Як зязюля ў пушчы кукавала,
Як шумелі вербы над ракой...

2.

Помніш, ты мяне зусім падросткам
Пасадзіў бярозку ля вакна.

Не пазнаць цяпер тае бярозкі,
Вырасла прыгожаю яна.
Бы цябе шукаючы, штодзённа
Ценню прабягае па двары.
Колькі жалю ў шэлесце зялёным,
Не пытайся і не гавары.
Цяжка, мілы, цяжка і тужліва,
Дні ўспомні, канчыць так, — калі
Хто не быў хоць крышку няшчаслівым
Той не знае шчасця на зямлі...

3.

Пройдзе ноч, дарогай праменістай
Дзень сустрэчы нашай прыбліжыць.
Зашуміць бярозанька ўрачыста,
Горда, як ніколі, зашуміць.
У сарочцы светла-васільковай,
Нібы ў дзень нараджэння, ты зноў
За сталом, за шчыраю размовай
Між гасцінных будзеш землякоў.
Пройдзе ноч, рассеюцца туманы.
Ясным днём пяройдзеш рубікон,
І патухне боль глыбокай раны,
Гора ўсё забудзецца, як сон...

4.

На траве некошанай, высокай,
На шырокім беразе ракі
Ты з сваёй дачушкай чарнавокай
Будзеш віць блакітныя вянкі.

Ёй пра тундру поўначы расскажаш,
Казку пра алені і пургу,
І пра гады чорны, як сажа,
Пра сваю глыбокую тугу.
І яна табе скорагаворкай
Мілы мой, раскажа, як было
Без цябе не весела і горка
І як раптам —
шчасце расцвіло...

## За гадамі гады мінаюць...

За гадамі гады мінаюць, праходзяць,
А я ўсё сяджу і сяджу.
Няўжо не дачуюся голасу: – выйдзе!
Неўбачу збавення мяжу?
Айчына, краіна мая, дарагая,
Бярозавы подых шляхоў,
Няўжо я ў пустыні выгнанны сканаю
Не скінуўшы з ног кайданоў?
Няўжо сонца праўды нікалі не ўсходзе
І праблiску волі няма?
За гадамі гады мінаюць, праходзяць,
Стаіць непарушна турма.

Я помню той дзень...

Я помню той дзень, краю родны, калі
Мяне разлучылі з табою... Як вецер
Насіў і ганяў па дарогам, па свеце
Знянацку сарваўшы бярозавы ліст –
І я іду падхоплены так і навалай
Занесены ў тундру, на мёртвыя скалы,
Дзе навіт в лапані трава не расла,
Дзе нельга і думаць ужо аб свабодзе...
Як дождж сярод яснага неба нахадзіць,
Туга беспрабудная раптам найшла.

Да столь кайло, дабываю руду.
Іду праклінаючы стужу і камень.
Па грудзі ў снягу сплацяваным вятрамі
Усё далей і далей на Поўнач іду,
На самы край свету. І там, дзе адвеку
Яшчэ не ступала нага чалавека,
Туга, як адзін з самых кроўных сяброў
Нікуды, на шаг ад мяне не адходзіць...
Як золата ў скалах паўночных знаходзяць,
Я ў смутку мальбу залатую знайшоў...

### N...

Ты як другім і ім заўсёды
Сказала — „не" таксама мне.
Але я веру:
па струне,
Па самай чулай штось кране
І ты ледзь чутна скажаш — „Згода"!..

## Ніводнага светлага дня...

Калі мы гаворым – палярная ноч, –
Мы тут разумеем – зіма.
А лета – яго на Таймыры даўно
Бываць не было і няма.

За месяцам месяц – дванаццаць кругоў
Пурга прабягае за год,
І лёнпе зоры дванаццаць разоў
Збіраюцца ў свой карагод.

А што застаецца, як пройдзе зіма,
Даецца табе, цятмыня.
На гора – ні кроплі ацяйку няма,
Ніводнага светлага дня...

## Дзьве дарожанькі

1.

Грымнуў гром і, як маршчыны,
На чале маёй зямлі —
Па нізінам, па раўнінам
Дзьве дарожанькі ляглі.

Раным-рана. Зайгралі
Іскры срэбнае расы.
Зараніцы яснай хвалі
Набягалі на лясы.

Пад бярозай, як крыніцы,
Ў ціхім шэлесце гаёў
Каб з любімай разлучыцца
Ён спаткацца з ёй прышоў.

Міг цяжкога расставаньня!
На вайну, на страшны бой
Ён ідзе і іх каханне
Арасілася сьлязой.

На ўспамін яму прынесла
З шоўку хустачку яна
З ніжна вышытай пралескай
Не-ўміручай, як вясна.

Ў гэту хустачку ўвярнула
Фото-картачку сваю.
- Ў добры час!.. Ідзі... - шаптала, -
Беражы любоў маю.

2.

За лясамі, недалёка
Віўся смерці чорны змей.
Сэрца мілай, чарнавокай
Вырываецца з грудзей.

Ён пайшоў. Шнураў не знаўшы
Шамацеў зялёны шоўк.
Цвёрдым паступам салдата
За Радзіму ў бой ішоў.

Ён ішоў у бой сурова
За шырокі родных ніў,
За касматыя шумы дубровы,
За сяло дзе ў шчасці жыў.

Ён ішоў. Яму дарогу
Сонца ярка заліло.
Колькі веры ў перамогу
Ў харастве палёў жыло.

Спелым коласам пшаніца
Прыпадала да зямлі,
І на ростані крыніцы
Ўсхваляваныя жалкі.

Нават песні на прывалах
Заліваўся салавей,
Толькі ў песні той гучала
Боль трывогі і надзей...

3

Слаўся подыхам пажараў
Вераломным бураном.
Засланілі сонца хмарай
Смерць і гора над сялом.

Застагналі людзі ў муках,
З лязгам кованай брані
Прапаўзла ля хат гадзюка–
Хаты мірныя ў агні.

Ходзяць дні па руінам,
Гнеў і стогнах іх вякі.
Па нівінам, па раўнінам
Цені шыбеніц расці.

Больш цярплівасці не стала,
Не сушыць дзявочых слёз.

Пра любімага згадала,
Пра яго нязнаны лёс.

Любы ветліва, харошы
У думах дзеванькі расцвёў.
Паглядзела на дарожку
Па якой у бой пайшоў.

І з праклёнам вераломству
Ноччу выбегла з сяла
І другой - дарожнай помсты
У партызанскі лес пайшла...

# Сябры...

Сябры збяруцца, ўспамінаюць
Жыццё на волі, родны край.
Праявы ў думках набягаюць,
Цыгаркі гаснуць неўзначай.

То як прыбой бурлівай хвалі
Узнятае штармам парой,
То цішыня ў вачах растаміць
Глухі агонь тугі нямой.

Гудзіць марозамі пустыня,
Туманам свет завалакло.
Успомніш ты, чаго ў памінке
Здаецца нават не было.

Хтось вобраз мілай прыгадае,
Вясёлы ўзлёт былой вясны,
Па свойму ціха заспявае
На мове сонца, скал, зурны.

На лад ад бацькі перанятыі
Хтось песняй пестуе ў душы-

Садок вішнёвы каля хаты,
Сей эпоў праслаўленага шыр.

Як жыць на бацькаўшчыне люба!
Аднак за свой кароткі век
Жыццё тады сваё галубяць
Калі ў пакуце чалавек...

## Благаслаўляю дзень і час

Калі-б ступіў на край зямлі,
Дзе я радзіўся, дзе прайшлі
Гады маіх трывог і захапленняў —
Чаго сніў-бы, шапку зняў
І на калені-б разам стаў
Шэптаючы малітву Нараджэння.

— Прымай мяне, мой родны край,
З дарог засовы паздымай,
Раскрый вароты ў светлыя прасторы.
Я на парозе новых дзён
Забуду ўсё, як цяжкі сон,
І крыж пацую і выклятае гора!..

Як верны сын, як Твой паэт,
Як зноў народжаны на свет
У вочы сонцу глянуў бы адкрыта.
І між заблытаных шляхоў
Сваю б дарожаньку знайшоў,
Што заткана травой-аксамітам.

Хачу жыццё сваё дажыць!
У жылах кроў агнём гудзіць,
Бушуе нерастрачанаю сілай.

Благаслаўляю дзень і час
Калі я зноў убачу вас
Прасторы бацькаўшчыны мілай.

## Краю родны...

Краю родны, я ўмеў ганарыцца
Неўміручым тваім харастом.
Я не раз накідаўся ваўком
Не даваў над табою глуміцца.

Неўміручым тваім харастом
Не адзін таргаваць мятуцеў.
Як хацелі цябе на калені
Перад чорным паставіць арлом.

Я не раз накідаўся ваўком,
Бараніў тваю славу і волю.
Хоць падкідышы з панскага поля
Мне гразілі з падполля мячом.

Я ім косткай у горле стаяў,
Не даваў над табою глуміцца.
Як прыемна табой ганарыцца
Дарагая краіна мая.

# Песня

Усюды дзе не буду
Той вечар не забуду,
Я з ёй сядзеў, ёй кветкі рваў,
Я цэлы ад пачатку і... маўчаў.

Яна не разгадала
Чым грудзь мая палала
І запрачыць, што быццам ёй,
Да смерці нудна быць са мной.

На злы дакор адразу
Я не знайшоў адказу,
Яна, як спалах, прыйшла,
Рукой махнула і... пайшла.

Нібы ў густым тумане
Пагарджаны каханнем
Я да світання прастаяў
Ледзь думаць думкі паспяваў.

Аднак пісьмо прыслала
У ім яна пісала
Калі развучышся маўчаць
Тады мы зможам сябраваць.

Я не разбуджу. Вечар
квапнючай сустрэчы.
Маўчаць не буду, я малю —
Вярніся зноў, я так люблю...

# Не шкадую

Хай мне суджана вызнаць пакуты
На зямлі ледзянога агня.
Не шкадую ні воднага дня
І ні воднай пражытай мінуты.

Пакідаючы змрок сутарэння
Колькі светлых лунала надзей.
Стаў я ў дні маладосці сваёй
Запявалам свайго пакалення.

Я гарэў неўгамонным задорам
Бурапенных юнацкіх прыгод.
Ідучы я не знаў перашкод,
Я не ведаў ні смутку, ні гора.

Кроў айчыны маёй бушавала
Разгаралась у жылах маіх.
Вейлым подыхам сіл маладых
Песня ўсюды мяне выручала.

Не баяўся вятроў непагоды,
Я ніколі не хмурыў чало.
Мне нічога мілей не было
Як юнацтва, любоў і Свабода.

Хай сягоння нямала смуты,
Хай гвалтоўна ссадзілі з каня.
Не шкадую ніводнага дня
І ніводнай пражытай мінуты...

## Будзе, спраўдзіцца ўсё гэта

Будзе, спраўдзіцца ўсё гэта:
Не багата зім і летаў
Пройдзе гулкага хадою
І ажыўлая расою
Зашуміць - закаласіцца
Закусцістая пшаніца
І тундры дзікай, неабжыванай,
Дзе не растаюць нідзе льда,
Дзе стосільным ураганам
Дзьмуць ветры акіяна;
Дзе пурга бушуе раз
Так, што сэрца замірае,
Дзе і сонца не запалае,
Дзе павісне над снягамі
Беспрасветна, месяцамі
Ноч палярная, глухая...

Будзе, спраўдзіцца ўсё гэта:
Трубы голас эстафеты
Загартаваны, бадзёры
Пранясецца над прасторам
Як вясновы першы гром —
Дзе бярлогі мядзвежае
Ўскалыхне ацень парогу,

І мы бачым зарніца,
Курапатка ўзварушацца
Ў цемры блiскучым крылом;
Дзе з плецамі-ваганамі,
Ля ў старэйшымі сябрамі
Нейалохаваю ўсамі
Караводзяць горнастаі
Ля вазёрных берагоў,
Дзе падкопленія вятрамі
Водгук носіць над снягамі
Зычны мой гападзінах пясоў...

Будзе, спраўдзіцца ўсё гэта:
На апрайке Сусвета,
За Ўралам, за Сібір'ю
Ў заснежаным Таймыры,
Дзе людзкой нагі слядоў
Не было ў пачатку вякоў,
На расьвечаным паляне
Ля ўрачыстага кастра
Легендарныя паданні
Будзе слухаць дзетвара —
А прыйшлі сюды дзеды іх
Жарам сэрца маладыя
І ўмагі перамагчы
Мерзлату даўгой начы;
А ўмагі лыж адужыць
Край ветроў, тумана, сцюж
Ў мы горда над прасторам
Панаравіцца моры і горы

Падымаўся Свецлы горад
Багатыр і чараўнік.
Ля вясёлымі світаннем,
Паламней налучых усмешку,
Тундру шчодра азарылі,
Каб вочы ёй адкрылі
Электрычныя агні.

Будзе, спраўдзіцца ўсё гэта:
Усміхнецца тундра летам,
І абуджаныя гэты
Подых кветак запалоніць.
Будзе колас красавацца,
Сокам сонца напівацца,
І зерне ручьём вясёлым
Хлыне звенячым у сёлы;
У застольных песнях будуць
Хмельным мёдам ліцца зноўда
Яблыневыя сады.
Толькі ўсё дружнай сям'ёй
Праляцяць і нагадаюць
Дні калючай бяды...

Будзе, спраўдзіцца ўсё гэта!
Да жаданай, ясной мэты
Блізка ўжо, таму прыметы
Ў рудніках і на заводах
Параходамі на водах
Самалётамі ў паднябессі
У блакітным затаянні
Расцвітае і нарастае

Неўміручы сум Крэмля.
Прайшлі ночы, прайшлі дні
І за працу ўзнагародай
Неўгамоннаму народу
Пакарыліся зямлі.
Тайнікі свае раскрыла
Залатые дорыць жыла
Медзі, нікель, цын...

Будзе, спраўдзіцца ўсё гэта:
Будуць мовай дружных нацый
Горда гімны пець паэты.
Гімн табе — свабодная Праца,
Гімн табе — у наш грозны век
Пераможца - Чалавек!..